**Лазука, І.** Часта сніцца Афган / І. Лазука // Голас Сенненшчыны. — 1998. — 19 студз. — С. 3.

## ЧАСТА СНІЦЦА АФГАН

Афіцыйна сродкі масавай інфармацыі паведамлялі, што абмежаваны кантынгент савецкіх войск у Афганістан быў уведзены 27 снежня 1979 года. Але гвардыі капітан Леанід Станкевіч трапіў туды на два дні раней. І не толькі ён адзін, а ўся слаўная Віцебская паветрана-дэсантная дывізія.

Гвардзейскі паветрана-дэсантны полк, у якім служыў Леанід намеснікам камандзіра 3-га батальёна, дыслакаваўся на станцыі Баравуха-1 пад Полацкам. А сам афіцэр быў камандзіраваны ў Лосвіда, дзе знаходзіўся вучэбны цэнтр дывізіі, камандаваць вучэбным батальёнам – будучымі сяржантамі-дэсантнікамі.

Трывогу аб’явілі 10 снежня. Станкевіча адкамандзіравалі назад, у родны 3-ці батальён. 12 снежня цягніком полк прыбыў у Быхаў. Адтуль 15 снежня самалётамі ваенна-транспартнай авіяцыі дэсантнікі былі дастаўлены ажно ў Сярэднюю Азію, у горад Чымкент. Там цэлых дзесяць дзён чакалі. Самалёты з дэсантнікамі ўзняліся ў паветра 25 снежня і прызямліліся ўжо ў Кабуле. На наступны дзень правялі рэкагнасцыроўку аб’ектаў штурма. На долю 3-га батальёна выпала браць Генеральны штаб узброеных сіл Афганістана, які знаходзіўся недалёка ад палаца Аміна.

Сігнал «Шторм-333» атрымалі ў 19 гадзін 20 мінут 27 снежня. Батальён, пры падтрымцы спецназаўцаў, рынуўся на штурм Генштаба. Гэта быў двухпавярховы будынак, даволі вялікі. Адна рота захапіла генштабаўскі арсенал, але афганскія ваенныя, якія тут працавалі, былі добра ўзброеныя.

– Гэта трэба было бачыць, – успамінае цяпер Леанід. – Яны, перапалоханыя, выскоквалі праз вокны. Але ж і стараліся адбіцца, стралялі, кідалі гранаты... Капітан разам з адной з рот браў кабінеты. І толькі ўдарам нагі адчыніў дзверы аднаго з іх, як перад вачамі бліснула белае полымя. Падаючы, адчуў, што вельмі горача стала твару.

Да 23 гадзін усё было закончана. Генштаб знаходзіўся ў руках віцебскіх дэсантнікаў. А Станкевічу забінтавалі ўсю галаву, нават вачэй не бачна. Асколкі ад гранаты трапілі яму ў твар. 31 снежня яго адправілі ў Саюз на лячэнне.

У шпіталі праляжаў ажно да красавіка 1980 года. Хапіла часу на роздум. Чаму менавіта іх дывізію накіравалі ў Афганістан? Былі дывізіі, якія знаходзіліся значна бліжэй да гэтай краіны. Адна нават размяшчалася ў Сярэдняй Азіі. Хутчэй за ўсё, таму, што віцебскія дэсантнікі мелі найбольш высокую баявую падрыхтоўку. Большасць афіцэраў, як і ён сам, прайшлі выпрабаванне ў Чэхаславакіі ў 1968 годзе. Мусіць, гэта ўлічылі там, наверсе, калі вырашалася пытанне аб аказанні Афганістану, як тады гаварылася, інтэрнацыянальнай дапамогі.

За штурм Генштаба Леанід Станкевіч, беларускі хлопец, родам з вёскі Заазер’е Ульянавіцкага сельсавета Сенненскага раёна, атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Ён стаў адным з першых узнагароджаных у той вайне, якая працягвалася дзевяць гадоў. Патрэбная яна была ці не, гэта іншая справа. Салдаты і афіцэры выконвалі загад Радзімы, не адступалі ад прысягі ні на крок.

У красавіку Леанід Станкевіч вярнуўся ў Афганістан, у родны полк, у свой 3-ці батальён. Праваяваў два гады. Такі тэрмін знаходжання там адводзіўся афіцэрам.

Затым ён вярнуўся ў Саюз і з 1981 па 1989 год служыў у Пскове. Час ішоў, і прыходзілася задумвацца аб звальненні ў запас. А ён падаў рапарт камандаванню з просьбай зноў накіраваць яго ў Афганістан. Чаму? Хіба мала дасталося за тыя два гады, што быў там?

– Вельмі спадзяваўся, што траплю ў сваю часць, – расказвае Леанід. – Хацелася закончыць службу ў тым палку, дзе яе пачынаў.

– І яго рапарт, хоць з цяжкасцю, але задаволілі. Маёра Станкевіча накіравалі не ў той полк, з якім ён трапіў у Афганістан, а ў суседні, у які быў накіраваны пасля заканчэння дэсантнага факультэта Ленінградскага ваеннага артылерыйскага вучылішча ў 1968 годзе і ў саставе якога быў у Чэхаславакіі. Так што мара збылася. Тут і праслужыў да вываду савецкіх войск. Хаця, праслужыў – гэта мякка сказана, праваяваў – так будзе правільней. Шынданд – асноўная база палка, адкуль дэсантнікі накіроўваліся на баявыя аперацыі ў розныя мясціны Афганістана. Герат, Фарах, Чахчаран, Кандагар, Гурыян – вось тыя правінцыі, дзе даводзілася Станкевічу ўдзельнічаць у баях з душманамі.

Неяк агентурная разведка данесла камандаванню, што праз мяжу з суседняй краінай збіраецца прайсці калона «духаў», як называлі салдаты сваіх праціўнікаў. Леанід Станкевіч з ротай дэсантнікаў на верталётах вылецеў да месца, дзе намячаўся праход варожай калоны. Дзікія горы, скалы, сярод якіх уецца вузкая, як прайсці аднаму грузавіку, дарога. Наладзілі засаду, чакалі. І вось паказалася аўтамашына з душманамі.

– Агонь! – скамандаваў Леанід.

І грымнулі стрэлы гранатамётаў, раздаліся кулямётныя і аўтаматныя чэргі. Не чакалі душманы засады і не змаглі арганізаваць агонь у адказ, хаця і стралялі ў бок дэсантнікаў даволі інтэнсіўна. Калона была разгромлена. Рота знішчыла дзесяць аўтамашын з жывой сілай. Дэсантнікі страт не мелі.

Колькі іх было, такіх баёў! Шмат, і не ўсе абыходзіліся без страт. Гінулі салдаты, гінулі афіцэры. Ні куля, ні асколак Леаніда больш не зачапілі. Мусіць, хапіла таго ранення, якое ён атрымаў пры штурме Генштаба.

Цяпер Станкевіч жыве ў родным Заазер'і. А Афганістан не забываецца. І вельмі часта прыходзіць да яго па начах, у снах. Зноў грукоча страляніна, грымяць верталёты, свішчуць кулі і набліжаюцца барадатыя душманскія твары. І даводзіцца тады прачынацца і доўга ляжаць без сну, бо тое, што прыйшлося пераражыць, з біяграфіі не выкрэсліць.

**І. Лазука**